

ЗА НАШУЮ І ВАШУЮ ВОЛЮ!

ПРАМЕНЬ

№7 КРАСАВІК 1990 г.

Выданьне Лепельскай аб'яднанай групы падтрымкі БНФ „Адраджэньне“

ЯК НЕФАРМАЛЫ ВЫБАРЫ «ПРАВАЛІЛІ»

Па Лепельскай выбарчай акрузе балатаваліся 2 кандыдаты ў дэпутаты: першы сакратар Лепельскага райкаму партыі Іван Шакола ды генерал-маёр з паліттадзьдзелу арміі Мікола Асініч. Ніводзін зь іх не набраў неабходнай колькасьці галасоў. Аб"яўлены перавыбары. Чаму ж так здарылася?

Ня будзем аналізаваць прычыну паражэньня невядомага нам дагэтуль генерала. Ён, можна казаць, атрымаў перамогу, схіліўшы на свой бок амаль палову выбаршчыкаў. А вось чаму не прайшоў вядомы кожнаму жыхару раёну першы сакратар?

У райкаме ва ўсім абвінавачваюць нефармалаў. Ёсьць доля праўды ў гэтым. Так, мы выдалі тысячу лістовак з заклікам выкрэсьліваць двох кандыдатаў. Так, мы, не праводзячы афіцыйных ды неафіцыйных сходаў, заклікалі сяброў, знаёмых, сваякоў галасаваць супроць двох кандыдатаў. Так, мы ў 5-м нумары "Праменя" зьмясьцілі зварот да выбаршчыкаў, у якім прасілі таго ж. Аднак жа ня болей паловы выбаршчыкаў чыталі ды чулі нашыя заклікі. Дый ня ўсе чытачы ды слухачы нашыя пагаджаліся з намі. Дык у чым жа справа?

Ня буду хапацца за эканамічныя пралікі першага сакратара ў пытаньнях гаспадараньня ў раёне, якія ў яго, безумоўна, ёсьць, бо сам ня ўпэўнены ў іх абгрунтаванасьці. Дый большасьці люду яны невядомыя. Спынюся толькі на ідэалягічных хібах фактычнага гаспадара раёну.

Самая галоўная прамашка — жорсткая вайна райкамаўцаў, аб"яўленая сябрам ды прыхільнікам БНФ з трыбун усіх маштабаў форумаў, сходаў, нарадаў ды старонак раённай прэсы. Думаючы, што гэтым дыскрэдытоўваюць нас у вачох народу, наменклатуршчыкі самі гэтым стваралі рэкламу новаму народнаму руху. Асабліва гэта адчулася ў апошнія перадвыбарчыя дні, калі "славуты" "Ленінскі сцяг" усе свае дзіды шпурнуў у Шушкевіча /гэта значыць у мяне/ ды яго паплечнікаў. Так, нешматлікія прыхільнікі пануючай ролі КП СС верылі ўсёй гэтай бруднай хлусьні. Аднак большасьць люду ахоплівала цікаўнасьць да таямнічых "інсургентаў", якія так не даспадобы прафесійным партыйцам. І лепельцы ішлі да нас, цікавіліся нашымі праграмай, прэсай. Дый пераконваліся ў нашым шчырым бескарысьлівым жаданьні зьмяніць стараццкае існаваньне народу ў лепшы бок. Шмат хто, разуверыўшыся ў добрасумленнасьці, шчырасьці ды жаданьні служыць народу партыйных босаў самых розных рангаў і нават ня ведаючы нашых пазіцыяў ды поглядаў, разважаў дасłоўна так: "Раз партыя супроць іх паўстала, значыць добрую справу задумалі хлопцы". Контрпрапаганда нашых дзеяньняў ператварылася ў прамую агітацыю за нас. Гэта — корань паражэньні на выбарах шматлікіх партыйных наменклатуршчыкаў па ўсёй Беларусі. /Тут мне могуць запярэчыць, што сярод абраных зь першага разу дэпутатаў Вярхоўнага Савету 93% партыйцаў. Гэта так. Аднак ня трэба атаясамліваць сумленных шараговых членаў партыі з прагнілай партыйнай наменклатурай. І большасьць сяброў ды лідэраў БНФ, якія былі абраныя, таксама партыйныя/.

Другая прамашка. Першы сакратар пад час сустрэчы з выбаршчыкамі паказаў кансерватыўнасьць ды рэакцыйнасьць сваіх поглядаў. Ён выказаўся супроць перагляду Канстытуцыі /у адказе на пытаньне аб адносінах да 6-га артыкулу/, паколькі заходнія канстытуцыі не перагля́даюцца па 200 год. Ён не жадае ўвядзеньня шматпартыйнай сістэмы ў краіне, паколькі на дадзеным этапе нашага разьвіцьця гэта выкліча дэстабілізацыю абстаноўкі. Ён не падтрымаў прапанову распачаць збор подпісаў пад зваротам у Прэзідыум надаць Лепелю дзяржаўны гандаль замест каапératыўнага, паколькі з 1991 году цэны на прадукты харчаваньня будуць аднолькавыя — што кааператыўныя, што дзяржаўныя /?/. І г.д.

Трэцяя прамашка. Дробязь, якая выклікала цэлы ажыятаж. Першы сакратар не стрымаў слова! Абяцаў выбаршчыкам з сакавіка скасаваць талоны на гарэлку, а іх выдалі перад самымі выбарамі.

Чацьвертая прамашка. Раённая газэта апошнім часам працягвала ўпарта прыпісваць усіх аўтараў "Праменя" да сяброў БНФ і корпацца ў "бруднай бялізьне" іх жыцьця. А людзі ж разумеюць, што той, хто піша ў "Ленінскі сцяг", неабавязкова павінен працаваць у райкаме. Зноў відавочная танная хлусьня.

Пятая прамашка. Яе можна было б нават назваць першай. Сакратар насуперак волі гараджанаў упарта імкнуўся зьмяніць статус Лепеля з гораду вабласнога падпарадкаваньня ў падпарадкаваньне раённае. Да сёньняшняга дня лепельцы абураюцца такім рашэньнем.

Шостая прамашка. Далёка ня ўсіх задавальнялі дарагія забаўкі пад час сьвятаў ды юбілеяў. Як можа ўспрымаць дарагія ёлку ды рэканструкцыю гарадзкога парку той, хто жыве ў прыватнай развалюсе, а чарга на жыльлё вымяраецца нават не дзесяткам год, ды той, хто пражыў жыцьцё без тэлефонаў, а будаўніцтва АТС законсервавана. Дый "гордасьць" раёну — стадыён — далёка ня ўсімі ўспрымаецца адназначна.

Сёмая прамашка. Райкам зрабіў усё магчымае, каб сарваць намечаны на 25 лютага мітынг. Так, гарвыканкам адмовіў у санкцыі на яго правядзеньне, паколькі заяўка была пададзена не па форме ды меней як за 10 дзён да пачатку акцыі. Аднак мы пагаджаліся з 300 рублямі штрафу і зьбіраліся яе праводзіць. Ды вось за 20 хвілін да пачатку зь мейсца, прызначанага для мітынгу, я быў ветліва запрошаны намесьнікам начальніка міліцыі Галаём на размову з начальнікам міліцыі ўсяго на 2 хвіліны. У размове, зноў жа ветлівай, удзельнічалі начальнік КДБ ды пракурор. Працягвалася яна за гадзіну. Як потым стала вядома, сцэнарый гэты быў загадзя распрацаваны ў райкаме. Мітынг не адбыўся. Аднак яго зрыў зрабіў большую справу, чым бы сказаныя на ім прамовы. Як шчупальцы спрута горад аблыталі чуткі: "Мітынгу пабаяліся", "Шушкевіча арыштавалі". Тлумачэньне "Ленінскага сцягу" пад загалоўкам "Як Шушкевіч мітынг арганізоўваў" толькі масла ў вагонь падліло, бо надрукаванае ў райгазэце заўсёды ды справядліва ўспрымаецца ў адваротнай інтэрпрэтацыі. За адзін дзень райкам адвярнуў ад сябе тысячы выбаршчыкаў. А "Ленінскі сцяг" аказаў свайму патрону мядзьведжую паслугу.

Больш дробязныя прамашкі ў дзейнасьці гаспадароў раёну з чырвонага будынку пералічваць ня варта. Прычына паражэньня на выбарах высьвятляецца яскрава. Хочацца толькі зьдзівіцца, чаму яе ня бачаць у райкаме? Абвінавачваюць ва ўсім нефармалаў, а сябе лічаць бязгрэшнымі сьвятымі. Няўжо там думаюць, што народ наш зусім дурны ды забіты-цёмны, таму і клюнуў не раздумваючы на вуду франтоўцаў, сьлепа адмовіўшы ў даверы "действи-

т[illegible] за св[illegible] стра[illegible]?
[illegible] толькі, што мы не за[illegible] выбар-
чы[illegible] ні [illegible] ні грэчкай, ні тушонкай, ні [illegible], ні гарохавымі карткамі як пад час выборчай кампаніі, так і ў дзень выбараў.

УЛАДЗІМЕР ШУШКЕВІЧ

ПАСХАЛИЯ НА 1991—2011 ГОДЫ

/даты указаны по старому стилю/

Годы	Начало Великого поста	Вербное воскресенье	Пасха	Дата святой троицы
1991	14 января	18 марта	25 марта	13 мая
1992	3 февраля	6 апреля	13 апреля	1 июня
1993	25 января	29 марта	5 апреля	24 мая
1994	7 февраля	11 апреля	18 апреля	6 июня
1995	30 января	3 апреля	10 апреля	29 мая
1996	22 января	25 марта	1 апреля	20 мая
1997	3 февраля	7 апреля	14 апреля	2 июня
1988	26 января	30 марта	6 апреля	25 мая
1999	18 января	22 марта	29 марта	17 мая
2000	7 февраля	10 апреля	17 апреля	5 июня
2001	22 января	26 марта	2 апреля	21 мая
2002	11 февраля	15 апреля	22 апреля	10 июня
2003	3 февраля	7 апреля	14 апреля	2 июня
2004	19 января	22 марта	29 марта	17 мая
2005	7 февраля	11 апреля	18 апреля	6 июня
2006	30 января	3 апреля	10 апреля	29 мая
2007	15 января	19 марта	26 марта	14 мая
2008	4 февраля	7 апреля	14 апреля	2 июня
2009	26 января	30 марта	6 апреля	25 мая
2010	11 января	15 марта	22 марта	10 мая
2011	31 января	4 апреля	11 апреля	30 мая

ПРАВОСЛАВНЫЙ ЦЕРКОВНЫЙ КАЛЕНДАРЬ НА 1990 ГОД.

ИЗДАНИЕ МОСКОВСКОЙ ПАТРИАРХИИ.

ПАВАЖАНЫ УЛАДЗІМІР КАНСТАНЦІНАВІЧ

і астатнія члены супольгі, вельмі ўдзячны Вам за тую справу якую Вы робіце, і вельмі задаволены тым, што яшчэ засталіся такія людзі як Вы.

Прыміце калі ласка маё сціплае ахвяраванне на выданне Вашай газэты Прамень.

Прабачце за памылкі бо не вельмі часта прыходзіцца пісаць на роднай мове.

Жыве Беларусь!

НАВУЧЭНЕЦ ЛГМТ. А.П.

АД РЭДАКЦЫІ: ліст пададзены бяз правкі.

ЦЕМРАШАЛЬСТВА

Добра ведаючы, што выданьне "Праменя" абыходзіцца нятанна, супрацоўнікі СПТВ-175 сабралі 28 рублёў ды перадалі ў рэдакцыю.

Жуценька быў склікана партыйны сход, на якім кіраўнікі СПТВ пачалі шукаць злачынцаў, тым самым парушаючы канстытуцыйныя гарантыі ды элементарныя чалавечыя правы. Працаўнікі СПТВ-175 не спалохаліся ды далі дастойны адпор "рэтывым" адміністратарам ды апалагетам сталінізму. Больш таго, ці ня гэты разбор паўплываў на тое, што сакратар партарганізацыі СПТВ Дзмітрыеў ня быў абраны ў абласны Савет.

Да якой жа ступені трэба сябе закансерваваць, колькі трэба мець у душы страху ды злосьці, да чаго быць бездухоўным ды безкультурным, каб вышэйапісаным дзеяньнямі выставіць сябе на сьмех усяму раёну.

З чым і віншуем адміністрацыю СПТВ-175!

ЖАБЗАЦ

АД РЭДАКЦЫІ. Адміністратары ды іншыя работнікі СПТВ-175 абураюцца, што ў "Прамені" ахвяравальнікі назвалі сябе камсамольцамі [illegible]: [illegible] узялі ўдзел у складках.[illegible]. Трэба было пазначыць: "[illegible] супрацоўнікаў".

ЧАМУ Я Ў ФРОНТ ПАЙШОЎ

Многія сябры задаюць мне пытаньне: чаму я пайшоў у БНФ? Думаю, іншым гэта таксама будзе ведаць цікава. Адказваю.

Я ня веру ніякай іншай грамадзкай сіле, бо адусюль чую толькі прыгожыя словы ды абяцанкі, а

краіна па-ранейшаму з касьмічнай хуткасьцю нясецца ў бездань. Рэальныя прапановы затармазіць гэты палёт я ўбачыў у Праграме БНФ. Проста, даступна, лёгка гэта зрабіць. Ды бяда ў тым, што ня па нутру нашаму запартыйнаму ўраду падказкі нейкіх там халопаў. Дык якім чынам зварухнуць гэты сонны ўрад? Зноў вельмі проста. Зьмяніць яго на прадстаўнікоў народу, якіх сапраўды хвалюе наш з вамі дабрабыт. А імі зьяўляюцца ніхто іншыя, як кіраўнікі Народных Франтоў. Толькі для гэтага падтрымаць іх павінны і я, і ты, і ён.

І ня слухайце правакатараў, якія сьцьвярджаюць, быццам Народны Фронт хоча аддзяленьня Рэспублікі ад Саюзу і выганяньня небеларусаў зь Беларусі. Так можа заяўляць толькі той, хто ў вочы ня бачыў Праграму БНФ. Пачытайце яе і вы не пабаіцеся сказаць даўно забытую фразу: "за дружбу народаў" Фронт!

ШАСНАЦЦАЦІГАДОВЫ СЯБРА БНФ

РАЁННЫЯ БУДНІ

Яшчэ да выбараў я пачуў у сьценах РАПА такую гісторыю. Аграном Рапа Шуневіч А.І., будучы ў калгасе "Салют", у час размовы выказаў меркаваньне, што ні адзін, ні другі кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савету БССР ня будзе адстойваць інтарэсы працоўных, і ён асабіста выкрэсьліць абодвух. Страшэнны "крымінал" прафарг калгасу Дзятлава Дзіна Рыгораўна Жуценька данесла сакратару райкаму прафсаюзу, сакратару партыйнай арганізацыі РАПА Калiноўскай Адзе Канстанцінаўне. Апошняя тут жа пераказала пачутае ў райкам ды занялася расьсьледаваньнем "крымінала", ад сябе дадаючы ды вышукваючы неверагодныя гісторыі. У той жа час паведаміла сама, а можа цераз райкам, начальніку раённага аддзелу МУС, і той выклікаў парушальніка лепельскай "сьвятой" ідэялёгіі, заснаванай на падхалімстве, страху, замешанай на хлусьні ды амаральнасьці у раённы аддзел міліцыі.

Начальнік аддзелу, чалавек развагіліва, зразумеў, што тут парушаюцца артыкул 50 Канстытуцыі БССР, артыкул 47 Закону аб выбарах, артыкул 19 Дэклярацыі правоў чалавека. Ён зразумеў, што ўсе абвінавачваньні безпадстаўныя, амаральныя па сваёй сутнасьці ды папрасіў прабачэньня.

Нельга чакаць прабачэньня ад райкаму ці ад бедных запалоханых жанчын, якія ад страху і бацьку, і маці прададуць. А калі яшчэ нейкую дзесятку накінуць да пенсіі ці заробку, дык і дзяцей не пашкадуюць. Не шкадавалі ж людзей падобныя ім у трыццатых гадох, пішучы даносы на суседзяў, знаёмых. Іхнімі ахвярамі запоўнена зямля Курапатаў, Кабылянскай гары, парку Чалюскінцаў ды іншых страшных мейсцаў Беларусі. Цяпер гэтыя "нінаандрэеўны" чакаюць свайго часу. Толькі дарэмна чакаеце. Ня будзе трыццатых! Прайшоў ваш час. Кусайце сябе за локці.

Людзі! Ня бойцеся казаць праўду. Гэта наша галоўная зброя супроць беззаконьня, супроць бездухоўнасьці, супроць неасталінізма. Будзем жа людзьмі.

Жыве Беларусь!

ПЕРАПЕЧКА.

АД РЭДАКЦЫІ: па Лепелю ходзяць чуткі, што Шуневіча А.І. арыштоўвалі, а потым саслалі на час выбараў зь Лепелю. Гэта няпраўда. Падстаў для арышту не было, а з гораду Шуневіч выехаў 23 лютага на вучобу ў БСГА. Курсы павышэньня кваліфікацыі ён закончыў 7 сакавіка, здаўшы на выдатна ўсе іспыты.

І яшчэ. Мы сьпецыяльна сустрэліся з аўтарам: ці не надта рэзка ён абвінавачвае дзьвюх жанчын. Аўтар адказаў, што меў на ўвазе не менавіта іх, а ўвогуле шматлікіх жанчын-наменклатуршчыц, якія служаць адпаведнаму Богу ня за ідэю ды сумленьне, а за страх ці грошы.

ЯК ФРОНТ У ЛЕПЕЛІ ВЯЧЭРАЎ

24 лютага закончыўся перадвыбарчы мітынг у Вушачы. Едзем зь менскімі франтоўцамі на іх "Жыгулях" у сталіцу. Захацелі тыя па дарозе есьці. Запрашаю да сябе на хату:

— Дом якраз на ўзбочыне менскай шашы знаходзіцца. А сам ды моя менскі [illegible].

Ніяк не пагаджаюцца хлопцы. Ня хочуць у чатырох гаспадыню турбаваць. Просяць завезьці іх у сталоўку.

Субота. Рабочыя харчоўні не працуюць. Таму

вязу іх у цэнтральную сталоўку, што на Чырвонай плошчы. Зачынена. Скіроўваемся да рэстарану. Абед. Аднак вось-вось праб'е 17 гадзін і ён адчыніцца. Чакаем.

Разам з натоўпам завальваем у зале.

— Гарэлкі няма! Разыходзьцеся! — даносіцца зьверху жаночы голас.

Натоўп выходзіць.

— Ня трэба нам гарэлкі. Так бы паесьці,— просімся.

— Нельга! Сталы ўсе замоўленыя на вечар.

— Ёсьць яшчэ сталоўка на вакзале,— вінавата кажу францоўцам.

Паспрабавалі тыя — відаць і там такое — дык на Менск галодныя паехалі. Да мяне так і не завіталі — клопаты гаспадыні.

Справа ня ў тым, што хлопцы з БНФ галоднымі засталіся. Не ўпершыню ім падцяўшы страўнікі хадзіць ды езьдзіць. Зьдзіўляе тое, як карчуюцца іншыя госьці гораду ды камандзіровачныя вечарамі ў выхадныя дні. Ня з раніцы ж ім замаўляць столікі ў рэстаране.

Вось вам гасьціннасьць па-лепельску!

УЛАДЗІМЕР ШУШКЕВІЧ

ВЕРШЫ ВЕРЫ БАРОДЗІЧ

КАРАБЕЛЬ БЕЛАРУСІ

Віхар часу гайдае жыцьця акіян,
І ў такой завірусе
Не мяне прызначаны курс капітан
Караблю Беларусі.

Віхар часу слабейшых закінуў за
борт,
Хтосьці хваляю змыты.
І ня верыцца, што дабярэмся у
порт
Мы на судне разьбітым.

АДЧАЙ

Як маглі Вы мяне
Параўноўваць з сабой
Так пагардліва,
Так бессаромна.
Бачу ў вашай душы
Я карозіі слой
Побач з шэрай пустэчаю цёмнай.
У сумленьні я бачу хваробу —
азноб,
Лепш хварэлі б душэўным азнобам.
Насмакталі з народу крыві
ныбы клоп —
Вам цяпер не адмыцца да гроба

" "
"

Сярод родных
Чужой адчуваю сябе,
Не сяброўская ж між суседзяў.
Мо зь мяне мох затхнёнасьці з
часам
Жыцьцё абскубе
І сумбур недавер"я працэдзіць.
Я занята маўчу,
Бо дарэмна казаць не хачу,
Калі стол для гасьцей мая маці
накрые,
Не магу прачытаць я свой вершык
Хаця і хачу,
Бо ад вершаў у іх алергія...
А гаворка
Злучаецца ў нешта адно —
Пра сваё кожны дбае карыта.
Перакрэсьлілі ўсё,
і душу заадно,
Не крануўшы
Мяшчанскага
быту.
" "
"

Мы гісторыі шмат
перавязваем ран,
Самі мы чынім ёй новыя раны.
А гісторыя — не дэтэктыўны раман
І на лёс яе хопіць тыранаў!
Немагчыма гісторыі поступ
спыніць,
Падаганяць біззуном немагчыма.
Спрабавалі ўжо к камунізму
сьпяшыць —
Заблытаўшыся ў догмы,
пранесьліся міма.
" "
"

Я бачыла душы людзкія,
Абгароджаныя калючым дротам,
У якія цяжка было зазірнуць.
І такія ведаю душы,
Якія штодня
Мяняюць сваё аблічча.
Замест душы ў некаторых
Я бачыла пустыню.
І яшчэ
Крывыя душы сустракала.
У іх так многа было тлуму...
А ў некаторыя глядзела,
Як у трухлявае дупло.
Ёсьць многа падрэтушаваных,
Падмаляваных душ,
Замкнутых і адкрытых насьцеж,
Душ-схованкаў для Муз.
Я бачыла людзкія душы
Без павуціннак дум.
Як нетры ёсьць душа,
Што ўтойвае так многа.
А ёсьць, што прадаецца за рублі.
Я ведаю душу, падобную на джала,
На сьвечку незгасальную. Яна
І скрынку можа даць,
Каб распаліць
папялішча
другой душы.

1990, ЛЕПЕЛЬ.

ФРОНТ! ФРОНТ! ФРОНТ!

ПЕСЬНЯ

Айчына, сьветлы вобраз твой —
Нязьменны наш маяк.
Хай цемра ладзіць нам канвой —
Я добра бачу, як
Працяг суседняга пляча
Жыве ў маім плячы,
І людажэрам-крумкачам
Нас не перамагчы!

ПРЫПЕЎ:

Фронт! Фронт! Фронт!
Ён мае і твае абуджэньне,
Ён народу майго адраджэньне!
Фронт! Фронт! Фронт!

Там сталініст, там бюракрат —
Рабы старых ідэй.
Яны ствараюць штурматрад —
Бандэю ўсіх бандэй.
Яны вядуць сьмяротны бой —
Ярлык, дубінка, газ —
І не валодаюць сабой,
Пачуўшы наш адказ:

ПРЫПЕЎ.

Я цьвёрда веру ў свой народ,
Абуджаны ад сну.
Вясны адчуўшы надыход,
Вітае ён вясну.
Якія б беды ні былі,
Запомні добра ты:
Каб жыць і выжыць на зямлі,
У фронт яднай шыхты.

ПРЫПЕЎ:

Фронт! Фронт! Фронт!
Ён мае і твае абуджэньне,
Ён народу майго адраджэньне!
Фронт! Фронт! Фронт!

СЯРЖУК СОКАЛАЎ-ВОЮШ
НАВАПОЛАЦАК

АД РЭДАКЦЫІ: нашага сябра ды сябра Фронту Сержука Сокалава-Воюша ў сёлетнім сакавіку прынялі ў Саюз пісьменьнікаў. Шчыра віншуем яго. Спадзяёмся, што ў хуткім часе там будзе і наша Вера.

ВІТАЕМ КАТАЛІКОЎ!

У Лепельскую Раду БНФ завітала 72-гадовая пенсіянерка Марыя Малахоўская ды выклала цікавы аповяд. Мы й ня ведалі, што на Лепельшчыне існуе каталіцкі рух. Аказваецца, што ў раёне звыш тысячы палякаў, беларусаў, украінцаў, літоўцаў выказалі жаданьне згуртавацца. Ініцыятары-каталікі ўжо даўно дамагаюцца вяртаньня ім касьцёла Сьвятога Казіміра пасьля рэстаўрацыі. Не адзін ліст быў скіраваны і ў Менск, і мясцовым уладам. Аднак пытаньне пакуль не вырашаецца. Уся справа ў тым, што касьцёл запланавана рэстаўраваць пад канцэртную залу. У такім выпадку частку сродкаў на рэстаўрацыйныя работы можна спагнаць з арганізацыі. А на культавы будынак яны не дадуць нічога.

— Мы ж не вінаватыя, — са сьлязьмі на вачах вядзе аповяд бабулька, — што ў нас калісьці касьцёл адабралі. Няхай за той, хто зрабіў гэта, расплаціцца грашыма за ўчыненае сьвятатацтва.

Не сьвятатацтва, а злачынства — дададзім ад сябе.

— А мы чым можам дапаможам, — працягвае баба Марыя. — І некалькі грошай на рэстаўрацыю зьбярэм, і самі выходзіць працаваць будзем.

І мы некалькі грошай зьбярэм. І працаваць падручнымі ў рэстаўратараў будзем. І заклікаем да гэтага ўсіх сумленных грамадзянаў гораду ды раёну. Не пакінем жа каталікоў сам-на-сам са сваёй бядою! Няхай на здароўе вераюць у свайго Бога. Ды падключаюць да веры іншыя масы насельніцтва. Таму і зрабілася нашае жыцьцё старэцкім ды гаротным, што ня маем мы Бога ў душы. Няхай сабе нашым Богам застаецца Фронт, а іхнім — сапраўдны Бог. Абы толькі сябравалі нашыя Багі паміж сабою. Ад сяброўства гэтага болей карысьці будзе, чым ад музыкі з канцэртнае залы, няхай сабе і арганнай.

Каталікі падалі заяву на рэгістрацыю каталіцкае супольнасьці ў Лепельскі гарвыканкам. Жадаем ім посьпехаў.

Калі каго зацікавіць каталіцкі рух на Лепельшчыне, зьвяртайцеся да нас ці на адрас: 211180, Лепель, Пушкінская, 6, Ермаловіч Станіслаў.

ЛЕПЕЛЬСКАЯ РАДА БНФ.

ПРЫВІТАНЬНЕ,СЯБРЫ

Сёньня атрымаў ад вас 5-ты нумар "Праменя". Дзякуй. Высылайце і надалей па аднаму асобніку. У сваю чаргу я дасылаю вам 2 асобнікі першага нумару варшаўскай газэты "Куцейна". Яе выдае наша Рада БНФ. Можа там, у Лепелі, вам будуць тра-

іляшца значкі з выявай вашага месца. Калі ласка, па магчымасьці набудзьце іх для мяне. Я зьбіраю значкі, прысьвечаныя Беларусі.

Да пабачэньня. 9.03.90.

АЛЕСЬ СЯРОЖКІН.
ВОРША.

АД РЭДАКЦЫІ. Сябра Алесь. Зірні на шапку "Прамені". Бачыш нацыянальную сымболіку? У думках адзьдзялі бел-чырвона-белы Сьцяг ды крапасныя сьцены. Застаўся шчыт з выявай Пагоні ды надпіс "Лепель". Гэта герб Лепеля. Упрыгожыць яго Лепель меў гонар Пагоняй за ўдзел у Грунвальдскай бітве жыхароў гораду ў 1410 годзе. Такія значкі прадаюцца ў Лепельскім краязнаўчым музеі. Дасылаем табе. Дзякуй за "Куцейны". Будзем і надалей абменьвацца газэтамі. У вобласьці толькі мы пакуль маем свае выданьні. Чамусьці маўчаць "Віцебскія званы".

ЯК ВЫЛУЧАЛІ КАНДЫДАТА

У Цэнтральную ды Акруговую выбарчыя камісіі, у рэдакцыю газэт "Літаратура і мастацтва" ды "Прамень".

ЗАЯВА

Просім выбарчыя камісіі адмяніць рашэньне канфэрэнцыі работнікаў заводу шасьцерань па вылучэньню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савету Беларусі /праходзіла 20 сакавіка 1990году/, а рэдакцыі газэт адлюстраваць няправільнае вядзеньне яе сакратаром партарганізацыі заводу Адамам Ташлiковічам. Будзем называць толькі памылкі.

1/. Некалькі дэлегатаў, якія былі абраныя працоўнымі калектывамі з разьлікамі 1 дэлегат на 5 работнікаў, не знайшлі сябе ў сьпісе дэлегатаў, а таму былі пазбаўленыя права голасу, які быў прадастаўлены іншым /Марковіч, Буевіч ды інш./.

2/. Адам Ташлiковіч заявіў, што канфэрэнцыя склікана згодна рашэньня партбюро, нават не заявіўшы, што роўна за тыдзень да яе ў Савет працоўнага калектыву старшым дыспетчарам заводу Уладзімерам Шушкевічам ды токарам Анатолем Мальчэўскім пададзена заява з просьбай разглядзець пытаньне аб скліканьні канфэрэнцыі. Савет працоўнага калектыву такога рашэньня не прымаў.

3/. Адам Ташлiковіч самазвана ўзяўся старшынстваваць на сходзе.

4/. Дэле эты адразу запатрабавалі вырашыць пытаньне аб парадку галасаваньня: тайным ці адкрытым, пакуль аўдыторыя не стамілася [illegible], жадаючы хутчэй вызваліцца не прагаласавала б за адкрытае галасаваньне. Адам Ташлiковіч самавольна перанёс апошняе пытаньне на галасаваньне пасьля абмеркаваньня кандыдатур.

5/. Абмеркаваўшы кандыдатуры, Адам Ташлiковіч ня даў згоды вылучаным кандыдатам у кандыдаты выступіць.

6/. Адам Ташлiковіч сам прапанаваў адкрытае галасаваньне, падбурхтоўваючы дэлегатаў канфэрэнцыі падаць голас за яго.

7/. Пры падліку галасоў Адам Ташлiковіч асабіста налічыў 67 мандатаў, якія ўзьняліся за адкрытае галасаваньне. Сьледам за ім токар Анатоль Мальчэўскі налічыў 53 такіх галасы /прысутнічала на канфэрэнцыі 119 дэлегатаў/. Запатрабаваньне часткі дэлегатаў перагаласаваць пасьля выбару лічыльнай камісіі Ташлiковіч ігнараваў.

8/. На прапанову Ташлiковіча абраць лічыльную камісію, дэлегат Пахомаў назваў кандыдатуры токараў Кірэева ды Мальчэўскага. Потым паступілі кандыдатуры начальніка аддзела працы ды заробкаты Міранскага ды тэхфоўтчыка Скакуна. Ташлiковіч залічыў апошніх два прозьвішчы, праігнараваўшы першыя. На ўдакладненьне Пахомава старшыня ўвагі не зьвярнуў.

9/. Паколькі канфэрэнцыя палічыла, што лічыльная камісія была абраная для падліку галасоў за метад галасаваньня, а Ташлiковіч адразу прапанаваў галасаваць за кандыдатаў у дэпутаты, 46 абураных дэлегатаў пакінулі залу.

10/. На заўвагу кандыдата ў дэпутаты Шушкевіча, што няма кворуму для галасаваньня /з абраных 150 дэлегатаў у зале засталіся толькі 73 /, Ташлiковіч адказаў, што канфэрэнцыя правамоцная, паколькі на пачатак галасаваньня зарэгістравалася 119 дэлегатаў /кворум быў/.

У выніку за жаданьнем райкаму партапарату кандыдата дырэктара заводу шасьцерань Ганчара прагаласавала адкрытым галасаваньнем 64 дэлегаты, 2 устрымаліся, 7 выказалася супроць.

Заданьне райкаму выканана! Заводзкі партактыў забалатаваў нежаданага кандыдата ў кандыдаты старшага дыспетчара Уладзімера Шушкевіча, якога вылучалі як прадстаўніка БНФ.

Ад імя большасьці калектыву заводу просім інстанцыі, да якіх зьвяртаемся, разабрацца ды лічыць канфэрэнцыю заводу шасьцерань не правамоцнай, а таму несапраўднай. *Усього 6 подписей*

ГРОМ ПОБЕДЫ, РАЗДАВАЙСЯ!

АНАТОЛИЙ МАЛЬЧЕВСКИЙ, ТОКАРЬ ЗАВОДА ШЕСТЕРЕН

АД РЭДАКЦЫІ: вартыкул падаецца бяз правак. Нагадваем, што меркаваньне аўтараў не абавязкова супадае зь меркаваньнем рэдакцыі ды кіраўніцтва БНФ.

Развитие общественно-политической ситуации в стране привело к размежеванию сил, одни из которых последовательно отстаивают принципы социалистического преобразования общества, другие с неменьшей последовательностью отрицают саму возможность такого преобразования.

Энгельс утверждает: "Всеобъемлющая, раз навсегда законченная система познания природы и истории противоречит основным законам диалектического мышления, но это, однако, не исключает, а, напротив, предполагает, что систематическое познание всего внешнего мира может делать гигантские успехи с каждым поколением". /Энгельс. "Анти-Дюринг", стр. 20. Политиздат. 1977 г./.

С каждым поколением история нашей страны имела не гигантские успехи во всех сферах человеческой деятельности, а значит, и в сфере "систематического познания всего внешнего мира", а заурядное сползание в болото "социального прогресса". Одни говорят о том, что важнейшим завоеванием социализма является индустриализация страны и забывают об азах диалектики: капиталистическая система производства могла бы произвести "индустриальную революцию" с меньшими затратами. Социализм буквально построен на "костях народа".

Всякий раз, когда речь заходит о том, что социализм мог иметь более примечательную форму, чем нещадную эксплуатацию масс, нас, противников этой системы прогресса, упрекают в том, что мы до конца не поняли прогрессивной сущности социалистического обновления общества. Нам говорят, что сущность социализма была деформирована, что в ранг абсолютной истины была возведена догма общенародной собственности — собственности социалистического государства. Государство и социализм сделали синонимом. Между тем личность в государстве /история может только подтвердить наши измышления/ оставалась преобладающей тенденцией укрепления самого государства, разумеется, если сводить роль личности в истории не к отдельной личности, а к сотрудничеству личностей, которые только и объединяются в государство, чтобы защитить свои интересы. Государство без личности пагубно, ибо оно насквозь эгоистично. В этом случае история пренебрегает эгоизмом масс и возвеличивает эгоизм отдельной личности. Октябрьский переворот в Росии пробудил к деятельности исторический эгоизм масс. И если бы в России того времени не оказалось личности, способной поставить себя выше общественного эгоизма, Россия пережила бы еще более страшный террор, чем сталинский. Диктатуру личности, а этой личностью мог быть и Каменев, и Троцкий, и Бухарин, заменила бы диктатура класса, а именно — диктатура пролетариата. *Продолж. следует.*

ШЧЫРА ДЗЯКУЕМ

сябрам, якія даслалі ахвяраваньні на выданьне "[illegible]".

навучэнец ЛГМТ А.П. – – – – – – – – – 3 рублі.
Галай Аркадзь зь Менску – – – – – – – 2 рублі,
гурт работнікаў заводу шасьцерань – 26 рублёў.

Нумар падрыхтавалі Уладзімер ды Валеры Шушкевічы і Мікола Барбаро.
Адрас для карэспандэнцыі ды пераводаў: 211130, Віцебская вобл., г.Лепель, вул. Менская, д.10, кв.13, Шушкевічу Уладзімеру.
Тэлефон: 2-14-13, Міколу Барбаро.
Кошт нумару ў Лепелі — 20 капеек.
Наклад 1000 асобнікаў.
Нагадваем, што бяз вашых ахвяраваньняў далейшае выданьне "Праменя" будзе немагчымым.
Друкарня Вітаса Калевіча.